Так, акцыянернае таварыства "ДСКБ па комплексу абсталявання для мікраклімату" працуе над стварэннем і ўдасканальваннем модульных камплектных кацельняў малой і сярэдняй магутнасці, у якіх высокія тэхнічныя паказчыкі і немалы попыт сярод спажыўцоў. А спецыялісты Брэсцкага політэхнічнага інстытута прадэманстравалі шматлікія распрацоўкі для падагравання вады і паветра з выкарыстаннем новага метаду спальвання паліва.

Іван КУКСА.

"Руслан" прызямліўся ў Брэсце ўдачна...

Самыя сучасныя авіялайнеры цяпер можа прымаць Брэсцкі аэрапорт. Сведчанне таго - паспяховая пасадка тут 19 лютага аднаго з самых магутных у свеце грузавых самалётаў АН-124 "Руслан", які выляцеў з Кіева і знаходзіўся ў паветры 45 мінут. Памеры гэтага гіганта ўражваюць. Толькі размах крылаў у яго 75 метраў, а ў вышыню ён роўны сяміпавярховаму дому. Унутры самалёта могуць свабодна размясціцца 183 легкавыя аўтамабілі.

Тэхнічная пасадка "Руслана" ў Брэсцкім аэрапорце, на думку мясцовых авіятараў, пацвярджае немалыя магчымасці горада над Бугам у аператыўным перамяшчэнні грузаў з Захаду на Усход паветраным шляхам. У нашай краіне такія самалёты можа прымаць яшчэ толькі сталічны аэрапорт.

Іван КУКСА.

Трох міністраў аб'яднаў біятлон

Мужчынская зборная страляючых лыжнікаў Беларусі, якая сёлета стала першай на чэмпіянаце свету па біятлону ў каманднай гонцы, напэўна, стамілася прымаць віншаванні. Але ўсе ж такі прыемна, калі твой поспех раздзяляе краіна!

На гэтым тыдні ўрачыстае ўшанаванне як мужчынскай, так і жаночай зборнай адбылося ў Раўбічах. Віншавалі з поспехам каманду біятланістаў кіраўнікі сілавых і ваенных ведамстваў краіны: міністр абароны Аляксандр Чумакоў, старшыня КДБ Уладзімір Мацкевіч, міністр унутраных спраў рэспублікі Валянцін Агалец.

Герою гэтага спартыўнага сезону магіляўчаніну Алегу Рыжанкову, а таксама Вадзіму Сашурыну датэрмінова было прысуджана званне старэйшага лейтэнанта. Алег Рыжанкоў стаў старэйшым лейтэнантам КДБ, Вадзім Сашурын — беларускай арміі. Усе спартсмены атрымалі ў гэты дзень каштоўныя прызы. А арганізавала свята Міністэрства спорту і турызму разам з Федэрацыяй біятлона рэспублікі.

Марыя ВІКТАРАВА.

Маленькая "клетка" вялікіх надзей

Як паведамляла ўжо БЕЛТА, у канцы мінулага тыдня ўрачы-гематолагі Гомельскай абласной клінічнай бальніцы сумесна з японскімі калегамі правялі першую трансплантацыю ствалочай перыфірыйнай клеткі крыві. Такая аперацыя (зрэшты, спецыялісты лічаць слова "аперацыя" не ўжываць у гэтым выпадку) паказана хворым на востры лейкоз і тым, каму гэта цяжкае захворванне можа пагражаць.

Па этычных меркаваннях адразу ж пасля трансплантацыі медыкі адмовіліся даваць якія-небудзь каментарыі. А калі першыя хваляванні мінулі і настаў рэабілітацыйны перыяд для хворага, карэспандэнт БЕЛТА сустрэўся з загадчыцай аддзялення дзіцячай гематалогіі абласной клінічнай бальніцы Таццянай Шуміхінай.

- Першым нашым пацыентам стаў адзінаццацігадовы хлопчык са Жлобіна, - расказвае доктар Шуміхіна. - Верагоднасць захворвання на лейкоз у яго была вельмі вялікая. Да трансплантацыі мы рыхтаваліся вельмі грунтоўна. Усе ўрачы прайшлі стажыроўку ў Японіі, а медыцынскіх сясцёр японскія калегі абучылі ў нашай клініцы. Наогул жа, упершыню аб такім лячэнні мы пачалі весці размову яшчэ 6 гадоў таму. З таго часу і пачалася падрыхтоўчая работа, якая ішла марудна з-за адсутнасці фінансавання. Але калі неабходнае абсталяванне амаль на 200 тысяч долараў прадаставілі японцы, а аблвыканкам дапамог сродкамі для аснашчэння ў абласной бальніцы спецыяльнай стэрыльнай палаты, змаглі ажыццявіць задуманае.

Тых, хто мае патрэбу ў такім лячэнні, на Гомельшчыне нямала, адзначыла Таццяна Шуміхіна, падкрэсліўшы пры гэтым, што ў клініцы гатовы аказваць дапамогу па новай методыцы як дзецям, так і дарослым.

Віктар КОТАЎ.

Устаноўлены дыпламатычныя адносіны з Перу

У беларускім пасольстве ў Маскве 19 лютага падпісана Камюніке аб устанаўленні дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Перу. З беларускага боку дакумент падпісаў Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Беларусі ў Расійскай Федэрацыі Віктар Даніленка.

БЕЛТА.

Крымінал

Кат атрымае па заслугах

Група прадстаўнікоў праваахоўных органаў Вялікабрытаніі другі тыдзень працуе на Брэстчыне. Яна займаецца расследаваннем па справе ваеннага злачынцы А.Саванюка, які цяпер пражывае ў Лондане. З пачатку года гэта пяты візіт да нас вартавых правапарадку з краіны туманнага Альбіёна. На гэты раз іх місія аказалася паспяховай. У вёсцы Тамашоўка Брэсцкага раёна ім удалося адшукаць сведку зверстваў нацысцкага ката.

Затрымалі аўтапатрашыцеляў

Зусім не простых пасажыраў затрымаў ноччу ў аўтамабілі нарад аддзела аховы Брэсцкага УУС. Акрамя іх у машыне былі выяўлены колы, чахлы для крэслаў і аўтазапчасткі. Як у хуткім часе высветлілася, гэта чацвёрка займалася тым, што патрашыла асабістыя аўтамабілі брастаўчан. У ходзе расследавання зладзеі прызналіся, што ў гэтую ноч учынілі тры крадзяжы з аўтамабіляў, а крыху раней - яшчэ чатыры. Усе патрашыцелі маладыя. Адзін з іх нічым не займаецца, двое працавалі на аўтазаправачнай станцыі "Лукойл", а адзін - вадзіцелем "Міжрайгаза". Цяпер усёй гэтай групе прыйдзецца паўстаць перад судом.

Аўтамабіль-"банк"

Мяркуючы па ўсім, салідных рыначных мянялаў затрымалі на трасе Брэст — Масква ў аўтамабілі "Форд-Эскорт" супрацоўнікі Кобрынскага РАУС. У салоне машыны, дзе знаходзіліся трое мясцовых жыхароў, былі знойдзены тры сумкі ўнушальных памераў з пачкамі грошай. Зафіксаваная сума склала 1 мільярд 75 мільёнаў беларускіх рублёў і 4400 амерыканскіх долараў. Цяпер па гэтаму факту спецыялісты аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі праводзяць расследаванне.

Іван КУКСА.

Затрыманы начны "паляўнічы"

Раніцай 18 лютага да супрацоўнікаў брэсцкай транспартнай міліцыі звярнулася грамадзянка з Вінніцы і паведаміла, што ноччу ў электрацягніку Мінск - Брэст на станцыі Бяроза невядомы хлопец, пагражаючы пісталетам, адабраў у яе новы спартыўны веласіпед коштам звыш двух мільёнаў рублёў.

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе ўпраўлення ўнутраных спраў на транспарце, грамадзянка, якая страціла надзею на вяртанне свайго веласіпеда, была надзвычай здзіўлена тым, што літаральна праз некалькі гадзін ёй паведамілі аб затрыманні і змяшчэнні ў следчы ізалятар дваццацігадовага С., які абакраў яе. Акрамя веласіпеда ў начнога разбойніка быў канфіскаваны і газавы пісталет "Вальтэр", з дапамогай якога малады чалавек, відаць, збіраўся разбагацець.

Таццяна СМІРНОВА, БЕЛТА.

У нашых суседзяў

Апальнага ксяндза падтрымалі вернікі

Дэманстрацыяй пратэсту адказалі каўнаскія вернікі на рашэнне архіепіскапа Сігітаса Тамкявічуса зняць з пасады рэктара Каўнаскага сабора св. Міколаса Архангела ксяндза Рычардаса Мікутавічуса і назначыць на яго месца ксяндза Альфонсаса Сварынкаса, які вызначаецца артадаксальнымі рэлігійнымі поглядамі і надта правымі перакананнямі.

Ранейшы рэктар, заявілі дэманстранты, быў не толькі працавітым ксяндзом, ён вядомы паэт, лаўрэат дзяржаўнай прэміі Літвы, актыўны грамадскі дзеяч. Рычардас Мікутавічус вызначыўся дабрачыннасцю, спачувальніцкай місіянерскай дзейнасцю, выключна высокай культурай і прывабнасцю. Яго заклікі да прымірэння, праўдзівасці і маралі заўсёды кранaлі душы вернікаў, і таму сабор, у якім ён вёў службу, стаў самым любімым духоўна-культурным цэнтрам каўнасцаў. Усё гэта яўна не задавальняла старых артадаксальных ксяндзоў і, відаць, пад іх націскам кіраўнік Каўнаскай епархіі архіепіскап С.Тамкявічус прыняў такое дзіўнае рашэнне.

Тысячы каўнасцаў, якія сабраліся на развітальную месу, са слязамі на вачах чакалі прапаведзі любімага пастыра. Аднак не дачакаліся. У яго здарыўся сардэчны прыступ прама ля сабора, і машына хуткай медыцынскай дапамогі адвезла яго ў бальніцу. Пасля гэтага тысячы каўнасцаў стыхійна пачалі мітынг пратэсту, стварылі камітэт па абароне Р.Мікутавічуса, пачалі падпісвацца пад просьбай да вышэйшага кіраўніцтва Каталіцкай Царквы Літвы адмяніць рашэнне архіепіскапа С.Тамкявічуса.

Ад сабора ўзбуджаныя вернікі і тыя, хто ім спачувае, з крыжамі і партрэтамі Р.Мікутавічуса пайшлі праз увесь Каўнас да архіепіскапа, каб там выказаць свае патрабаванні. Аднак іх голас пачуты не быў: рашэнне С.Тамкявічуса не адменена, канфлікт вернікаў з кіраўніцтвам Царквы працягваецца. Аднак прыхаджане не маюць намеру адступаць і рыхтуюць дэлегацыю для паездкі ў Рым, да папы Іаана Паўла II з просьбай абараніць апальнага ксяндза.

Альгімантас БРАЗАЙЦІС.

Брытанскія біяфармацэўты маюць намер супрацоўнічаць

Вывучыць стан навукова-даследчай работы і вытворчага сектара біяфармацэўтычнай галіны нашай рэспублікі - такая мэта брытанскай біяфармацэўтычнай місіі, якая прыбыла з рабочым візітам у Мінск.

Як паведамілі ў Пасольстве Вялікабрытаніі ў Беларусі, брытанскія спецыялісты маюць намер сустрэцца з кіраўніцтвам Міністэрства аховы здароўя, наведаць канцэрн "Белбіяфарм" і вядучыя інстытуты Акадэміі навук, якія займаюцца распрацоўкамі ў галіне фармацэўтыкі і біялогіі. Па выніках гэтага візіту ў Мінск яны падрыхтуюць даклад для Міністэрства гандлю і прамысловасці сваёй краіны, дзе вызначаць перспектывы супрацоўніцтва Беларусі і Вялікабрытаніі ў гэтай галіне.

Аляксандр ЛЮШКЕВІЧ.

Кінематограф краін СНД зацікавіў еўрапейцаў

Адзін з вядучых італьянскіх прадзюсераў, вядомы ў кінасвеце як сеньёр Анджэла, мае намер фінансаваць здымкі фільма па сцэнарыю і ў пастаноўцы ўкраінскага рэжысера Юрыя Ільенкі. Работа над карцінай, якая з"яўляецца буйнейшым украінскім кінапраектам дзесяцігоддзя, пачнецца напярэдадні 2000-годдзя Ражаства Хрыстова і будзе прысвечана другому прышэсцю Хрыста на Зямлю.

Прадзюсер Анджэла, які зрабіў вялікі ўклад у стварэнне многіх фільмаў Андрэя Таркоўскага, у адным са сваіх апошніх інтэрв'ю падкрэсліў, што ў Італіі нанава пачынаюць адкрываць кіно краін СНД. Паводле яго слоў, у Еўропе апошнім часам назіраецца павышаная цікавасць да паэтычнага кінематографа, у прыватнасці, да фільмаў Сяргея Параджанава і Юрыя Ільенкі. Магчыма, замежныя інвестары звернуць увагу яшчэ на некалькі карцін, у тым ліку на новыя праекты расійскіх, украінскіх і беларускіх кінематаграфістаў.

БЕЛТА.

Неабходна прыняць спецыяльны закон аб захаванні незалежнасці Беларусі

Трэба, на мой погляд, распрацаваць і прыняць спецыяльны закон аб захаванні незалежнасці Беларусі. У ім павінен быць артыкул аб забароне агітацыі за далучэнне самастойнай краіны Беларусі да іншай дзяржавы з мэтаю палітычнага аб'яднання. У міжнароднай практыцы ёсць шмат цывілізаваных формаў узаемакарысных зносін і эканамічнай інтэграцыі. Карыстайцеся, як гэта робяць цывілізаваныя краіны, якія ў адну "камунальную кватэру" не аб'ядноўваюцца. Бо гэта, як у сярэднявеччы, зноў будзе Арда з вялікім цэнтрам і вялікай данінай гэтаму цэнтру. Але гэта ўжо было, развалілася і зноў разваліцца...

Марат ГІРКО, жыхар г.Мінска.

Народная Воля
22 ЛЮТАГА 1997 г.

Жена Авраама Линкольна выплескивала горячий кофе мужу в лицо

Сколько попадается странных супружеских пар! Кто из женщин не выслушивал откровения подруги, и симпатичной, и неглупой, жалующейся на своего изверга: и пьет, и бьет, и гуляет, — но уйти от него ей в голову почему-то не приходит. А сколько образованнейших и интеллигентнейших мужчин женились на примитивных и вульгарных лахудрах!

Еще как-то можно понять Гете, Гейне, Расина и Жан-Жака Руссо, которые выбирали себе в подруги жизни очень простых неграмотных женщин. Правда, супруга Гете любила выпить, а дражайшие половины Расина и Гейне ни разу не поинтересовались, что же пишут их мужья. Но все они были верные, хозяйственные, с хорошим характером.

Но как прикажете понимать Андреа дель Сарто, чья жена, ревнивая и недобрая, отвадила от дома всех друзей художника? Ученики дель Сарто выслушивали от нее резкости и колкости, а когда художник заболел, она ушла от него, боясь заразиться.

Супруги Дюрера и Шеридана были жуткими мотовками. Жена Шеридана еще любила при случае упрекнуть драматурга в неумении обращаться с деньгами, а Дюрер, чтобы его упрямая и злая транжирка могла купить себе очередное платье, был вынужден работать даже ночью.

У второй жены Джеймса Уатта была мания чистоты: она возмущалась запачканным фартуком мужа (кожаным, между прочим, — его стирать не надо было) и его грязными руками. В итоге она велела перенести мастерскую изобретателя на чердак. К тому же она была скупа: ложась спать, приказывала слуге гасить свечи и у мужа, даже если он работал, даже если у него были посетители. Уатт целыми днями возился на своем чердаке и сам себе готовил.

Жена Авраама Линкольна была ревнива, горда и надменна. Если ей что-нибудь не нравилось, она выплескивала в лицо мужу чашку с горячим кофе.

Ян д'Акоста, придворный шут Петра I, женился на сварливой и злой женщине, изменявшей ему налево и направо. Она была маленького роста, что позволило острослову как-то заметить, что из всех зол он все-таки выбрал наименьшее. Он прожил с ней больше 25 лет, и когда друзья стали намекать ему на серебряную свадьбу, д'Акоста сказал: "Подождите, братцы, еще 5 лет, тогда будем праздновать тридцатилетнюю войну".

И никто из них не развелся и просто не сбежал от своих благоверных!

Конечно, до свадьбы все девушки ангелы, откуда потом только змеи берутся? Хотя, может, прав был Александр Дюма, который на вопрос, почему он женился на женщине, уже давно ему надоевшей, бодро ответил: "А чтобы отделаться от нее!"

ЭКСТРА-ПРЕСС.

Соблазн для пассажира

По лотерейным проездным билетам ездят теперь казанцы в городском электротранспорте. Стоит такой билет тысячу рублей, однако при удачной комбинации цифр выигрыш составит от 5 тысяч до 5 миллионов рублей. С помощью этой идеи, рассказала газета "Вечерняя Казань", местная администарция надеется обеспечить денежные вливания в развитие городской инфраструктуры со стороны пассажиров. Для сравнения, обычные талончики стоят в Казани 600 рублей.

По горящей траве босиком. В восемь лет

Случаи, когда человек не чувствует боли, медицине известны давно. Однако несколько по-другому обстоит дело с 8-летним мальчиком Кэланом Блекетом из графства Йоркшир (Великобритания). Из-за аллергии ребенок не только не знает, что такое боль, но и понятия не имеет о синдроме смертельной опасности. Никогда не испытывая чувство страха, он считает чрезвычайно привлекательными различные рискованные ситуации. Например, однажды Кэлан поджег сухую траву на газоне за домом и стал бегать по горящей земле босиком.

Его мать Сандра надеется, что лондонские специалисты помогут ребенку, который, в противном случае, может погибнуть.

Госпожа Солнце больше не светит

Во Франции похоронили самую известную гадалку

Родившись в двух шагах от Лионского вокзала, она была самой знаменитой гадалкой послевоенной Франции, настолько хорошей, что звезды, быть может, даже заранее открыли ей обстоятельства ее собственной смерти: во сне, в возрасте 86 лет, за четверть часа до воскресной полуночи, в своей парижской квартире... Ее настоящее имя было Люси Солей, ей самой больше нравилось называть себя Жермен Солей, а миллионы французов звали ее Мадам Солей — Госпожа Солнце: ее радиопредсказания были для многих единственным лучиком надежды на перемены к лучшему в жизни и в семье.

Родилась Жермен Солей под знаком Рыб в 1910 году в сколь большой, столь и скромной семье. Звезды всегда благоприятствовали Люси, в ее жизни было все — слава, телевизионная реклама, безумные романы. Подлинным звездным часом Мадам Солей стал 1970 год, когда ее, 60-летнюю, пригласили на радиостанцию "Европа-1", чтобы превратить в первого во Франции, а может быть и в Европе, радиоастролога. На протяжении 23 лет изо дня в день приходила она в студию и предрекала судьбу миллионам французов. А свою собственную нашла лишь в возрасте 78 лет, когда вышла замуж за предпринимателя моложе ее на 19 лет.

Жермен с гордостью показывала близким друзьям собственноручное письмо генерала Шарля де Голля, которое он направил ей с выражением благодарности за удачное предсказание результатов президентских выборов 1965 года, когда он был переизбран на пост главы государства. Десять лет спустя Жермен Солей, которая к тому времени уже не нуждалась ни в какой рекламе, получила от другого президента неожиданный "рекламный подарок", который сделал ее имя нарицательным. Преемник де Голля — Жорж Помпиду, пытаясь отвязаться на одной из пресс-конференций от расспросов особо назойливого журналиста, воскликнул: "Откуда мне знать — я же не Мадам Солей!"

А.ШТОРХ.

"Новости разведки и контрразведки".

Неужели рак отступит?

Революцию в лечении рака может сделать открытие австралийских ученых. Обнаруженный ими фермент уничтожает в организме больного мертвые или отмирающие клетки, что позволит, предполагают ученые, отказаться от многих нынешних методов, таких, как радиационное облучение и химиотерапия, которые небезопасны для людей.

Самый дорогой футболист

Кестутис ГИМБУТАС

Самый дорогой футболист мира Алан Ширер занимает третье место в списке лучших игроков 1996 года, выбранных в ходе опроса, проведенного ФИФА.

Третьим он оказался и по итогам анкеты популярного еженедельника "Франс Футбол".

После церемонии награждения лучших футболистов мира, состоявшейся в столице Португалии Лиссабоне, журналисты спросили А.Ширера, не обидно ли ему: до первого места оставалось чуть-чуть, а он везде оказался третьим.

"Для меня вообще явилось неожиданностью, когда объявили, что наряду с бразильцем Рональдо и либерийцем Ж.Веа я претендую на титул футболиста года. Опередить Рональдо я и не рассчитывал", — дипломатично ответил англичанин.

А.Ширер блеснул в матчах финального турнира прошлогоднего чемпионата Европы, проходившего в Англии. Он стал лидером нападения английской сборной, забив 5 голов и став результативнейшим игроком чемпионата.

До этого турнира А.Ширер полтора года никак не мог поразить ворота соперников, выступая в составе сборной Англии.

После первенства Европы А.Ширер стал самым дорогим футболистом мира. "Ньюкасл Юнайтед" заплатил за этого нападающего его прежнему клубу "Блекберн Роверс" 15 миллионов фунтов стерлингов.

Летом 1992 года "Блекберн Роверс" купил А.Ширера у "Саутгемптона" за 3,3 миллиона фунтов стерлингов. В чемпонате Англии сезона 1994—1995 годов А.Ширер забил 34 гола и помог "Блекберн Роверсу" выиграть первенство.

А.Ширера, родившегося 31 августа 1970 года, называют машиной для забивания голов. В нынешнем чемпионате Англии он уже 17 раз обезоруживал вратарей соперников и вместе с Яном Райтом из "Арсенала" лидирует в списке снайперов.

"Я верю, что мои голы помогут "Ньюкасл Юнайтед" выиграть чемпионат Англии", — говорит А.Ширер.

Долгое время лидировавший "Ньюкасл Юнайтед" занимает после 24 туров четвертое место, уступая стоящему на первом месте клубу "Манчестер Юнайтед" пять очков.

Рыбаки выловили... подлодку

Останки первой в мире паровой подводной лодки Resurgam, сооруженной в 1870 году, обнаружены недавно вблизи ливерпульского залива. В 1879 году субмарину, созданную Джорджем Гэррэтом, постигла катастрофа в районе между южноанглийскими городами Рилом и Портсмутом. В свое время исследователь Уильям Скэнлэн-Мэрфи написал книгу о создателе этого корабля и даже потратил огромные деньги на поиск его фрагментов на дне моря, но безуспешно.

Еще восемь лет назад один из английских специалистов Ури Геллер высказал предположение о том, где можно обнаружить Resurgam. Однако в то время Скэнлэн-Мэрфи не поверил его словам, руководствуясь в этом вопросе прежде всего сохранившимся каким-то чудом корабельным журналом затонувшей субмарины, которую он искал в 15 милях западнее указанного Геллером места. Но именно здесь, причем совершенно случайно, и была найдена подлодка, о которую зацепились сети местных рыбаков. На 21-метровую глубину спустился аквалангист, который и засвидетельствовал ценность "улова". Согласно планам, работы по подъему лодки со дна морского начнутся весной будущего года.

ЭКСТРА-ПРЕСС.

22 лютага — 1 сакавіка

ШТО, ДЗЕ, КАЛІ?

■ ВЫСТАВЫ

Нацыянальны мастацкі музей прапануе выставу, прысвечаную 125-годдзю з дня нараджэння народнага мастака Расіі і Беларусі Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Таксама тут працуе выстава малюнкаў і фотаздымкаў Генрыха Цыле.

У Палацы мастацтваў з 25 лютага можна пабачаць выставу, прысвечаную памяці І.Давідовіча.

У Нацыянальным музеі гісторыі Беларусі *з 27 лютага* можна пазнаёміцца з выставай "Мастацтва і рэлігія".

У Рэспубліканскім выставачным цэнтры працуе кніжны кірмаш.

■ КАНЦЭРТЫ

У канцэртнай зале "Мінск"

22 лютага — часопіс "Еўрастыль" і прадзюсерскі цэнтр "Клас-Клуб" у цыкле канцэртаў "Галівуд-Рок" прадстаўляе Аляксандра Градскага.

23 лютага — канцэрт Аляксандра Малініна.

27 лютага — выступае Расійскі дзяржаўны акадэмічны камерны "Вивальди-оркестр".

28 лютага — Ірына Алеграва прадстаўляе праграму "Я тучи разведу руками".

У канцэртнай зале "Кастрычнік"

25—26 лютага — канцэрт Міхаіла Жванецкага.

У Палацы культуры чыгуначнікаў

25—27 лютага Санкт-Пецярбургскі тэатр мініяцюр прадстаўляе музычную камедыю "Ищи ветра в поле".

У канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі *1 сакавіка* адбудзецца дабрачынны канцэрт-эсэ Ігара Паліводы "У першы дзень вясны". У канцэрце прымаюць удзел зоркі беларускай эстрады.

У Палацы шахмат і шашак *з 18 лютага* праходзіць трэці адкрыты чэмпіянат першынства Беларусі па шахматах і шашках.

Тэатр "Бульвар смеха"

22 лютага прадстаўляе электшоу "Бульварное чтиво".

У начным клубе "Макс-шоу"

22 лютага — выступае група "Рублёвая зона".

23 лютага — аматараў творчасці Гарыка Крычэўскага запрашаюць на начную канцэртную шоу-праграму.

У бокс-клубе "Рэактар"

22 лютага адбудзецца прадстаўленне новага сольнага альбома групы "Чай вдвоем" (Санкт-Пецярбург).

У Доме літаратара

27 лютага — Тэатр аднаго акцёра "Зніч" прадстаўляе абанементны спектакль "Любоў прасветлая" з удзелам Ніла Гілевіча.

У Нацыянальным акадэмічным тэатры оперы і балета

26 лютага ўпершыню ў Мінску пройдзе "Московская Юморина-97", у якой удзельнічаюць Яўген Маргуноў, Георгій Віцын, Нона Мардзюкова, Наталля Крачкоўская і ... адным словам усе тыя, каго мы добра ведаем па фільмах Леаніда Гайдая.

■ ТЭАТРЫ

У Нацыянальным акадэмічным тэатры оперы і балета

22 лютага — канцэрт "Любімыя арыі".

23 лютага — канцэрт "Маладыя галасы".

25 лютага — канцэрт Малога сімфанічнага аркестра "Minsk Orchestra". Мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор — В.Кайтэль (Германія).

27 лютага — Дж.Расіні "Севільскі цырульнік", камічная опера ў дзвюх дзеях. Дырыжор В.Кайтэль (Германія).

1 сакавіка — канцэрт любімых арый.

Нацыянальны тэатр Янкі Купалы

22 лютага — М.Задорнаў "Таполевая завея", камедыя ў дзвюх частках. На Малой сцэне — Д.Коўберн "Гульня ў джын", трагікамедыя ў дзвюх частках.

23 лютага — на Малой сцэне Э.Іанэска "Віват, Імператар!", трагіфарс у адной дзеі паводле п'есы "Крэслы".

24 лютага — М.Чачот "Ажаніцца — не журыцца", беларускія вадэвілі ў трох дзеях.

26 лютага — Ж.-Б.Мальер "Нежанаты мнагажэнец, або Залёты пана дэ Пурсаньяка", камедыя ў дзвюх дзеях.

27 лютага — Ю.О'Ніл "Лэдзі Нявіннасць", трагікамедыя ў стылі блюз з адным антрактам.

28 лютага — Р.Горын "Памінальная малітва", камедыя ў дзвюх дзеях па матывах твораў Шолама-Алейхема.

1 сакавіка — "Паўлінка", на Малой сцэне — ПРЭМ'ЕРА! "Чароўная ноч".

Тэатр драмы "Дзе-Я?"

23 лютага, 1 сакавіка — М.Гоголь "Жаніцьба", зусім неверагодныя здарэнні.

У Тэатры-студыі кінаакцёра

22 лютага — "Мы идем смотреть "Чапаева".

Дзяржаўны тэатр лялек

22, 23 лютага — "Приключения Оловянного Солдатика, Пастушки и Трубочиста".

25 лютага — "Соловей".

26 лютага — "Мышонок Мыцык".

27 лютага — "Похождения бравого солдата Швейка".

28 лютага — "Божественная комедия".

1 сакавіка — "Волшебная лампа Алладина".

Нацыянальны тэатр-студыя "Вольная сцэна"

23, 27 лютага — "Заложніца кахання".

28 лютага — 1 сакавіка — "Паваліўся нехта".

Мінскі тэатр сатыры і гумару "Хрыстафор" запрашае:

28 лютага — на лепшыя нумары, створаныя за апошнія дзесяць год, "Выбранае".

1 сакавіка — на безалкагольныя пасядзелкі "Добра сядзім".

Тэатр юнага гледача

22 лютага — Ю.Кулік "Ноч на Івана Купалу".

22 лютага — У.Гібсан "Стваральніца цуда".

23 лютага — В.Гауф "Петар Мунк і яго каменнае сэрца".

25 лютага, 1 сакавіка — ПРЭМ'ЕРА! Г.Палонскі "Ніхто не паверыць".

26 лютага — В.Зімін "Жылі-былі дзве лісічкі".

27 лютага — Б.Мятальнікаў "Анчутка".

28 лютага — С.Маршак "Кошчын дом", а таксама Я.Шварц "Голы кароль".

У Тэатры музычнай камедыі

22, 28 лютага — "Принцесса цирка".

23 лютага — "Золотой цыпленок".

26 лютага — "Летучая мышь".

1 сакавіка — "Марица".

У Дзяржаўным маладзёжным тэатры

22, 28 лютага — "Я жадаю быць каханай".

25 лютага — "Малышка Эліс".

26, 27 лютага — "Два пінгвіны".

1 сакавіка — "Прыйшоў Мужчына да Жанчыны".

Падрыхтавала
Марына КОКТЫШ.

Хочаце верце, хочаце – не верце

Будучы тыдзень: зоркі прадказваюць

Авенам (21 сакавіка — 20 красавіка) — вясёлыя кампаніі, якія не выключаюць верагоднасць выпадковага кахання з першага погляду. Оскар Уайльд у такім выпадку "наказваў": "У каханні ўадрозненне ад заручын ёсць рамантыка, таму што яно не заўсёды заканчваецца шлюбам". Увогуле, тыдзень запомніцца неверагоднай колькасцю добрых перспектыў у фінансавых пытаннях і матэрыяльных накапленнях. Не спадзявайцеся на выпадак, рабіце ўсё ўласнымісіламі.

Цяльцам (21 красавіка — 21 мая) — прыемныя пачуцці. Калі прадстаўнікі моцнага полу раптам вырашаць зрабіць сваёй каханай падарунак, то зоркі раяць не забываць, што "не варта дарыць жанчыне нічога такога, што яна не зможа апрануць вечарам". Не забывайцеся на сваіх блізкіх, родных і каханых. Пастарайцеся правесці амаль што ўвесь вольны час з імі. Планеты раяць не губляць смеласці і час ад часу выкарыстоўваць сваё працоўнае становішча ў вырашэнні канфліктаў.

Блізнятам (22 мая — 21 чэрвеня) — самакрытыку. Зоркі не раяць трапляць у палон былых успамінаў і быць вельмі ўпартымі — гэта дасць магчымасць пераадолець жыццёвыя непрыемнасці. У прафесійнай сферы не пашкодзяць праявы нават залішняй настойлівасці. Незалежнасць і арыгінальнасць у паводзінах добра паўплываюць на фінансавае становішча. Больш надавайце ўвагі стану свайго здароўя.

Ракам (22 чэрвеня — 23 ліпеня) — сур'ёзнасць у вырашэнні ўсіх сваіх спраў. Не выключаны нечаканыя, але прыемныя сюрпрызы з боку блізкіх вам людзей. Будзьце гатовыя да сур'ёзных сутычак з канкурэнтамі. Напэўна, з гэтай нагоды давядзецца ўспомніць пра былыя знаёмствы і сувязі. Тыдзень запатрабуе ад вас гібкасці, канкрэтных прапаноў і дзеянняў, а таксама пяшчотных і шчырых пачуццяў.

Львам (24 ліпеня — 23 жніўня) — амурныя прыгоды. Ці патрэбна вам канспірацыя — вырашайце самі. Аднак памятайце, што ў асоб супрацьлеглага полу незвычайная інтуіцыя: яны могуць здагадацца аб усім, акрамя самага відавочнага. Расплануйце час так, каб паспець выканаць ужо на гэтым тыдні ўзваленыя на вас абавязкі. Не варта пужацца нечаканай крытычнай сітуацыі. Ад вас запатрабуюцца шчырая ўсмешка, рашучасць у дзеяннях, і праблемы вырашацца нібыта самі сабой. Зоркі раяць напрыканцы тыдня наведаць Храм Божы.

Дзевам (24 жніўня — 23 верасня) — скандалы. Не выключана, што на гэтым тыдні муж і жонка зробяць для сябе вывад ці адкрыццё, што не падыходзяць ні характарамі, ні поглядамі адзін аднаму. Што зрабіць? Зоркі раяць не рабіць нічога. "Самая моцная аснова для шлюбу — узаемнае непаразуменне", — запэўніваў Оскар Уайльд. Асцерагайцеся сяброўскай здрады і прастуднай хваробы. Спрыяльны час для заняткаў высокаінтэлектуальнай дзейнасцю і пачатку арганізацыі новага прадпрыемства.

Шалям (24 верасня — 23 кастрычніка) — нічым не справакаваную агрэсіўнасць. Уцешцеся тым, што вам усё роўна лепш, чым на самой справе, бо кожны чалавек — бунтар па натуры, прычым бунтуе выключна супраць самога сябе. Зоркі не раяць на гэтым тыдні злоўжываць выпадковымі інтымнымі адносінамі. Планеты папярэджваюць, што гэта дрэнна адаб'ецца на стане вашага здароўя. Нягледзячы на шматлікія справы і клопаты, у вас будзе дастаткова часу для сяброўскіх сустрэч.

Скарпіёнам (24 кастрычніка — 22 лістапада) — вырашэнне вечна філасофскіх пытанняў жыцця. Калі мужчын на гэтым тыдні апануе жаданне ажаніцца, то памятайце, што шчасце жанатага мужчыны цалкам залежыць ад тых жанчын, на якіх ён не ажаніўся. Атрыманне нейкіх важных паведамленняў і звестак прымусіць вас адправіцца ў невялікае падарожжа. Не пускайцеся ў рызыкоўныя сітуацыі. Не выключаны візіт да гінеколага.

Стральцам (23 лістапада — 21 снежня) — дабрабыт. Пры агульнай спрыяльнасці для вас наступнага тыдня "пад манастыр" вас здольная падвесці асоба супрацьлеглага полу. Калі гэта жонка ці муж, лічыце, што вам пашанцавала, бо толькі па-сапраўднаму добрая жонка ці муж здольныя на сапраўдны неразумны ўчынак. Тыдзень пройдзе ў дзелавых сустрэчах, нарадах і раз'ездах. Аднак гэта ніякім чынам не паўплывае на інтэлектуальную дзейнасць і гарачае пачуццё да блізкага чалавека.

Казярогам (22 снежня — 20 студзеня) — рамантычныя знаёмствы. Будуючы час ад часу іх планы, зоркі раяць ненавязліва даведацца пра... узрост суразмоўцы. Мужчын пры гэтым планеты папярэджваюць, што больш давяраць трэба той жанчыне, якая гаворыць, колькі ёй год: яна сапраўды можа ўсё... Адным словам, асабістае жыццё на гэтым тыдні прыпаднясе вам некалькі сюрпрызаў. Але амаль што ўсе хатнія перамены вырашацца на вашу карысць.

Вадалеям (21 студзеня — 19 лютага) — праблемы. Верагодна, што амаль на працягу ўсяго тыдня будзеце заняты вырашэннем філасофскага пытання, чаго вам не хапае для поўнага шчасця. Калі пераканаецеся, што праблема толькі ў каханым чалавеку, то прыслухайцеся да выказванняў класікаў: "Мужчына можа быць шчаслівы з усялякай жанчынай пры ўмове, што яна яго не кахае". Тыдзень скончыцца ўсеагульнай гармоніяй і душэўнай, але не вельмі прыемнай размовай з кіраўніцтвам.

Рыбам (20 лютага — 20 сакавіка) — філігранную хітрасць. Магчыма, на гэтым тыдні давядзецца хлусіць, нават у сферы вельмі асабістых адносін. Зоркі не раяць рабіць з-за гэтага маральную трагедыю. Трэба мець на ўвазе, што ў справах першаступеннай важнасці самае галоўнае — стыль, а не шчырасць. Шмат прыемных эмоцый на гэтым тыдні падаруюць блізкія людзі.

ТЕЛЕПРОГРАММА (сохрани на всю неделю!)

Понедельник, 24 февраля

Белорусское телевидение

7.30 Утренний коктейль.
7.50 Экономикст.
8.00 Резонанс.
8.45 Мультфильм.
9.05 Студия "Окно". "Накануне будущего". "Остров вдохновения", "Телек-шоу".
10.10 Бон тон. Конкурс "Девушка месяца".
10.20 Темная комната. Цыгане.
10.55 "Театральные истории". Худ.фильм.
11.45 Телевизионный Дом кино.
12.25 Композиторы Беларуси. К 80-летию Эдди Тырманд.
13.00, 15.00, 18.00, 24.00 Новости.
15.10 Видеокурс французского языка. Передача 4-я.
15.40 ТВ — школе. Музыка. 6-й класс. Песня в творчестве белорусских композиторов.
16.10 Параграф. Рынок труда.
16.40 "На добрый лад". Передача из Бреста.
17.00 Музыкальный антракт.
17.10 Гости в дом. Страны Севера холодного.
17.45 Экономикст.
18.20 "Робокоп". Телесериал (США).
19.10 "Музыкальная обойма". Белорусский хит-парад.
19.15 Тема дня.
19.30 "Это мы не проходили..." Экономическая программа.
19.45 Белорусский дом. "Наследие". Новогрудчина.
20.10 Зеркало. Программа для женщин.
20.30 Музыкальный антракт.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.50 Фильмотека. А.Папанов в худ.фильме "В городе С."
23.30 Музыка без границ. Информационно-музыкальная программа.

ОРТ

11.00, 14.00, 17.00, 22.20 Новости.
11.15 Программа передач.
11.25 Лыжи. Чемпионат мира. 10 км. Мужчины. Трансляция из Норвегии.
13.00 КВН-ассорти.
13.20 Авторская программа Г.Скороходова "В поисках утраченного". Сара Леандр.
14.20 "Альберт — пятый мушкетер". Мультсериал.
14.45 Марафон-15.
15.00 Звездный час.
15.40 "Нико и его друзья". Молодежный сериал.
16.10 "...До шестнадцати и старше".
16.35 "Вокруг света".
17.15 "Девушка по имени Судьба". Сериал.
18.05 Погода.
18.10 Час пик.
18.35 "Угадай мелодию". Телеигра.
19.00 Понедельник с Познером. Программа "Мы".
19.45 "Спокойной ночи, малыши!".
20.00 Время.
20.40 Программа передач.
20.45 Фантастический сериал "Полтергейст". 6-я серия.
21.40 "Серебряный шар". Фрэнк Синатра. Ведущий — В.Вульф.
22.30 Линия кино. Александр Кайдановский в фильме "Волшебный стрелок".
0.25 Пресс-экспресс.
0.40 Программа передач.

Канал "Россия"

7.00, 10.00,16.00,19.00,22.00 Вести.
7.15, 8.25, 9.55 Товары — почтой.
7.25 "Клубничка". Телесериал.
7.55 "Дорогая редакция..."
8.35 Анонимные собеседники.
9.05, 10.15 "Санта-Барбара". Худ.фильм.
13.25 Тамара Гвердцители и Мишель Легран в Нью-Йорке.
13.50 Чемпионат мира по лыжным видам спорта. 10км. Женщины.
14.30 Бесконечное путешествие.
15.00 Вместе.
15.25 Домашний доктор.
15.30 Новое "Пятое колесо".
16.15 Иванов, Петров, Сидоров и другие.
16.55 Там-там новости.
17.05 Лукоморье.
17.25 Посмотри на себя.
17.40 "Клубничка". Телесериал.
18.10 Двойной портрет.
18.40 Особо важные персоны.
19.35 Мультфильм.
20.10 "Санта-Барбара". Худ.фильм.
21.05 Погода на завтра.
21.10 "Добрый вечер".
22.30 "На коне". Телелотерея.
22.45 Дежурная часть.
23.00 "Алло, я вас слышу..." Музыкальная программа.
23.40 Шоу долгоносиков.

Санкт-Петербург

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 21.55 Информ ТВ.
12.10 "История любви". Сериал.
13.00 Срок ответа — сегодня.
13.25 Советы садоводам.
14.10 Международное обозрение.
14.45 "Поживем — увидим". Телесериал.
15.10 Овертайм.
15.40, 20.40 Телеслужба безопасности.
16.10 Дом кино. Штрихи к портрету друга. С.Курехин.
16.50 Детское ТВ: "Желтик", "Ребятам о зверятах", "Золотой ключ".
17.30 Шостакович — знакомый и незнакомый.
18.30 Санкт-Петербург приглашает Олимпиаду-2004.
18.40 Сокровища Петербурга.
19.10 Спорт.
19.20 "История любви". Сериал.
20.10 "Касается всех".
21.00 Кубок Англии по футболу. В перерыве (22.00) — Событие.

НТВ

5.00 Сегодня утром.
9.15 Утречко.
9.30 Фестиваль аргентинского кино. "Дом ангела".
11.00, 13.00, 15.00 Сегодня днем.
12.00 Открытый мир.
13.20 Большое "Времечко".
15.35 Дистанция 60.
16.35 Кинотеатр юного зрителя. Худ.фильм "Голубое дерево".
17.30 Футбольный клуб.
18.00, 21.00 Сегодня вечером.
18.40 Герой дня.
19.05 Мир кино. К.Буассон, Э.Фантастикини, В.Фабрици в фильме Д.Гальярдо "Удушливая жара".
21.40 Времечко.
22.00 Час сериала. "Скорая помощь" (США).
23.00 Сегодня в полночь.
23.20 Ночное "Времечко".

ТВ-6

6.00, 8.00, 13.50, 18.55, 20.00, 22.45 Шесть новостей.
6.10 Диск-канал.
6.40 Мультсериал "Возвращение Д'Артаньгава". 9-я серия.
7.10, 23.00 Дорожный патруль. Сводка за неделю.
7.25, 13.05 90 х60 х 90.
7.45, 10.20 Аптека.
8.10 Киноподробно.
8.30 Юмористическая программа "ОСП-студия".
9.20 Нью-Йорк, Нью-Йорк.
9.50 Спорт недели.
10.30, 12.50 Телемагазин "Спасибо за покупку!"
11.00 Кинотеатр ТВ-6. "Одиночество бегуна на длинную дистанцию" (Великобритания).
13.20 Мультсериал "Возвращение Д'Артаньгава". 10-я серия.
18.00 Юмористический сериал "Дэвис учит жить". 25-я и 26-я серии.
19.05 Ток-шоу "Музыка и пресса": "Акулы пера". Владимир Шаинский.
20.15 Театральный понедельник.
21.05 Посольские вечера. Вечер в посольстве Индии.
22.15 Катастрофы недели.
23.10 Диск-канал.

8-й канал

18.00 Для детей. Летающий дом.
18.30 Худ. фильм "Этюды о Врубеле".
19.45 Христианская программа.
20.15 Мульт-планета.
20.25 Справочная служба-экспресс.
20.30 Сериал "Кадфаэль".
21.45 Музыка на телеканале.
22.15 Кинокомедия "Мягкие кровати, жестокие бои" (Франция).

Вторник, 25 февраля

Белорусское телевидение

7.30 Утренний коктейль.
7.45 "Музыкальная обойма". Белорусский хит-парад.
7.50 Экономикст.
8.00, 13.00, 15.00, 18.00, 23.45 Новости.
8.10 Бездельник.
8.40 "Это мы не проходили..." Экономическая программа.
9.00 ТВ — школе. Музыка. 6-й класс. Песня в творчестве белорусских композиторов.
9.30 Мультфильмы.
9.45 Туробъектив.
10.05 "Робокоп". Телесериал (США).
10.55 "Когда же пойдет снег?.." Видеофильм.
12.05 Четвертое измерение. Абрис.
12.30 Акколада.
15.10 Все про все.
15.35 ТВ — школе. История Беларуси. 8-й класс. Белорусское национально-освободительное движение в период 1905 — 1907 гг.
16.05 Педагогический экран. Внеклассная работа со школьниками.
16.30 Острый угол. Правовой тележурнал по письмам зрителей.
17.00 Музыкальный антракт.
17.10 Уроки Н.Новожиловой.
